БЕЛАРУСЬ

Штадзенная політычна-эканамiцкая і літэратурная газэта

пад агульным кіраўніцтвам Язэпа Лёсіка.

ГОД ВЫДАНЬНЯ II.

Падпіска на 1 м-ц з перасылкай 45 мар.

АБВЕСТКІ: на 4-й страніцы ... за радок петыту

Газэта выходзіць штодня ...

Рэдакцыя і Кантора: Менск, вул. Мі... Дом (б. Юбілейны).

Рэдактар прымае ад ... гадз. Кантора ... ад 9 да 3 гадз.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і з адрэсам аўтора.

Аплата прынятых рукапісаў залежыць ад рэдакцыі.

Рукапісы назад не выдаюцца.

ЦАНА НУМАРУ 3 МАРКІ.

№ 130 (186). Менск, Субота 19 чэрвеня 1920 г. № 130 (186).

Паведамленьне Гэнэральнага Штабу Польскіх Войскаў.

Ад 17—VI.

На паўночным фронце між азёрамі Ельня і Шаль нашы аддзелы пасьле ўпартых баёў пасунуліся ўперад, заняўшы мясцовасьці—Шаду, Мураўшчыну і Окунево.

У раёне возера Мяжуххаль адбіты бальшавіцкіе атакі.

К поўдню і захаду ад Чарнобыля на лініі ракі Ушы прадаўжаюцца ўпартые бaі. Аддзелы нашы адкінулі ворага за раку Вярэню.

Дзякуючы пляномерным манёўрам, аддзелы нашай пяхоты і кавалерыі абкружылі і разьбілі ў раёне Радамысьля адну з дывізіяў коннай арміі Будзеннага. Наша здабыча—800 палонных, 2 гарматы і 600 вазоў бальшавіцкага абозу.

Шэф опэрацыйнага аддзелу
і начальнік штабу
Стахевіч,
Палкоўнік гэн. штабу.

У дні крызысу.

Урадовы крызыс у Польшчы, каторы, здавалася, будзе нядоўгі, прымае сур'ёзны характар. З стадыі перагавораў, узаемных уступак і згоды ён перайшоў у стадыю політычнай барацьбы паміж двума крайнімі лягэрамі—правым і левым. Барацьба гэта прымае цяпер вельмі сэвязны характар. У гэтай барацьбе праціўнікі карыстаюць з усіх спосабаў. Трэба адзначыць, што абодва праціўнікі начуваюць за сабою вялікую сілу і шмат спосабаў барацьбы. Хто будзе пераможцам—цяпер сказаць трудна. Калі-б навет шалі пераважыліся сёдня на бок аднаго каторага з праціўнікаў, то гэта яшчэ не азначала-б яго пабеды.

Урадовы крызыс у Польшчы быў для шмат каго неспадзяванкай. Раптам міністар заграничных спраў, Патэк, зьехаў заграніцу, перадаўшы кіраўніцтво міністэрствам не свайму памоцніку Домбскаму, а новай асобе, каторую ён назначыў у дзень свайго выезду, п. Дамброўскаму. Партыя, дэлегаваўшая Домбскага ў урад, варнула яго назад. Іншые фракцыі гэтак сама паадклікалі сваіх прадстаўнікоў з ураду. Крызыс стаў зьдзейсьненым фактам. Сапраўды-ж крызыс насьпеў даўно. Можна упаўнена сказаць, што ён быў ужо тагды, калі гэты урад быў толькі што ўтвораны. Гэты крызыс, ліквідаць цяпер, залежыць ад таго, што Сойм не выяўляе пачуваньняў народных мас і не здавальняе яго патрэб, што зусім адсоўвае Сойм ад політычнага жыцьця краю. Якіе б там блёкі не рабіліся, яны ня будуць моцнымі і трывалымі, і дзеля таго не даюць ураду той „цьвёрдай рукі“, каторая патрэбна цяпер, у гэты мамэнт, калі перад польскім народам стаіць цэлы рад адказных і паважных спраў унутранога і надворнага характару, ад каторых можа на доўгіе годы залежыць доля Польшчы.

Яснасьцю і поўнасьцю ў сваіх заданьнях абладаюць цяпер дзьве крайніе групы—„эндэкі“ і „пэпэсоўцы“, і вось паміж імі і адбываецца цяпер барацьба, навокал іх і вырашаюцца далейшые лёсы польскага народу. Калі загаварылі аб магчымасьці утварэньня цэнтра-левага габінэту, эндэкі асталіся спакойнымі пазірачамі. Іх гэтакі габінэт не палохаў.

Яны ведалі, што сіла застаецца на іх боку, і ў патрэбны мамэнт ім пашанцуе разьбіць гэтую падманную большасьць. Але вот „пэпэсоўцы“ паказалі некаторую жвавасьць. Яны зрабілі колькі ўступак фракцыям, каторые увайшлі з імі ў блёк, але выгаварылі сабе право іграць першую ролю ў справах вайны і міру. Яны хацелі з таго ураду, ў каторы павінны былі-б увайсьці, зрабіць урад міру. Здавалося, што ў гэтай справе асаблівых спорак няма,—міру хоча народ. Яго хочуць і „эндэкі“. Але іншая справа, які гэты мір будзе. І тут „эндэкі“ раптам угледзілі вялікую для сябе небясьпеку. Ад пасыўнага ладу яны перайшлі да актыўнасьці. Надворные акалічнасьці якраз к гэтаму часу злажыліся на іх карысьць. Польскае войско пакінуло Кіеў. „Эндэкі“ намагаліся ўсё гэта вытлумачыць крахам польскай політыкі на Украіне і, у першую чаргу, сталі вінаваціць у гэтым сваіх галоўных ворагаў, „пэпэсоўцаў“. Ня гледзячы на тое, што адход на Украіне, як выясьнілі гэта офіцыяльные прадстаўнікі камандаваньня, ня ёсьць ваенным паражэньнем, а толькі патрэбны стратэгічны манёўр,—„эндэкі“ абвясьцілі гэты факт крахам польскай політыкі на ўсходзе.

І вось, кінуўшы словы, яны перайшлі да дзела. Калі, здавалася, ўсё было ўжо гатова, каб ліквідаваць міністэрскі крызыс,—эндэкі зрабілі ўплыў на няпэўные ў сабе фракцыі і разьбілі ілюзію соймавай большасьці. Калі-ж быў высунуты проэкт „дзелавога габінэту“, ў каторым портфэль міністара заграничных спраў меў аддаць пэпэсоўцу Дашынскаму,—эндэкі прышлі да Начальніка Дзяржавы і заявілі свой протэст проціў гэтакага спосабу ліквідацыі урадовага крызысу. Яны катэгорычна выказаліся проціў таго, каб міністрам заграничных спраў быў соцыялісты Дашынскі, вінавацячы яго ў тым, што ён быў тварцом польска украінскай умовы, каторая цяпер сябы правалілася. Крызыс зноў загостраўся. Ужо вырашаные пытаньні зноў былі аддаены на перагляд. Эндэкі здабылі першую пабеду. Гэта дало магчымасьць аднаму выдатнаму прадстаўніку эндэкаў, Дамброўскаму, кіраўнічаму бюро друку міністэрства заграничных спраў, разаслаць цыркуляры заграніцу, што „украінская політыка Польшчы аплачвалася самім жыцьцём“.—аступленьнем польскім войскам Кіева.

Эндэкі пачуліся, што настаў рашучы мамэнт, што цяпер можна даць бой. Але ці прымуць яго пэпэсоўцы?

Бо дзеля таго, каб прыняць гэты бой, трэба быць добра падгатаваным, трэба выказаць сваю сілу. А ці ёсьць гэтая сіла. Ці падгатаваны апорны пункт, на каторым можна было-б сказаць: далей—ані з месца?

У соцыялістаў яго няма, у эндэкаў ён ёсьць. І цяпер, калі справа ідзе перш за ўсё аб міру, эндэкі могуць аказацца ў лягэры пераможцаў. Ім лягчэй цяпер заключаць мір. Яны зьяўляюцца заклятымі ворагамі прынцыпаў вызваленьня паняволеных народаў і іх самаазначэньня; ў іх ёсьць пэўная програма ў справе польска расійскіх адносін. На гэтую програму пойдуць напэўна і бальшавікі. Рахуючыся толькі з рэальнымі фактамі, бальшавікі ўжо ў першай сваёй ноце да польскага ураду прапанавалі Польшчы граніцу на „лініі Дмоўскага“.

Граніца, дзе Беларусі гэта будзе адмова ад прыгожых лёзунгаў самаазначэньня народаў, ад вялікай гістарычнай ролі Польшчы ў вырашэньні пытаньня Ўсходняй Эўропы, бо эндэкі заўсюды былі і ёсьць ворагамі ўсіх дэмакратычных прынцыпаў.

Затое яны могуць даць краю скоры мір. Прызнаемся гэтак здаецца ім самім, і ў гэта можа паверыць змучаны вайною народ. Гэтага ня могуць даць пэпэсы, бо яны стаяць за дэмакратызм, за самаазначэньне народаў. Ім далёка трудней згаварыцца з бальшавікамі. Калі яны будуць кіраваць політыкай,—яны дадуць толькі безпадстаўнае заміранне, але надоўга зацягнуць наступленьне сталага міру. Бальшавіком лягчэй будзе згаварыцца з соцыялістамі і лягчэй пойдзе гутарка з рэакцыянэрамі. Якая іронія! Але гэта—факт.

Эндэкі гэта бяруць пад увагу. Яны ведаюць, што ў гэты мамэнт,—мамэнт надзвычайны і паважны,—яны могуць зусім танна купіць сабе сімпатыю народных мас. А гэта азначае умацаваньне на доўгіе часы ў Польшчы рэакцыі.

Мы дэтальна затрымаліся на міністэрскім крызісу ў Польшчы дзеля таго, што гэты крызыс ёсьць разам з гэтым і крызыс у справе ўсходняй політыкі Польшчы. А ўсходняя політыка Польшчы—гэта нашая доля, гэта доля нашай незалежнасьці, непадзельнасьці, гэта лёс нашага далейшага нацыянальнаго і дзяржаўнага разьвіцьця.

Палажэньне вельмі паважнае. Нам пагражае вялікая небясьпека.

Мы ня хочам вайны. Але мы ня можам прыняць і таго міру, каторы пакінуць нам бяз нашае згоды, бяз волі нашага народу. Вось дзеля гэтага ў нас няма выбару. Мы—разам з тою польскай дэмакратыяй, каторая стаіць за зьдзейсьненьне вялікага лёзунгу самаазначэньня. Мы кажам: цяпер, у гэты адказны мамэнт, яна не павінна быць адзінока. Яна павінна шукаць сабе як можна больш прыхільнікаў і саюзьнікаў ды шукаць сабе як можна больш апорных пунктаў.

Як бы там ня трапілася, але польска-украінская ўмова ёсьць бязсьмертны гістарычны факт. Ён не памрэ ніколі, яго не выкасуеш з гісторыі. Ён зьдзейсьніцца, хіба сама Эўропа ідзе ня к жыцьцю, а к сьмерці. Польска украінская умова будзе рэальным фактам.

І вось у гэты мамэнт, калі паміж польскай дэмакратыяй і польскай рэакцыяй адбываецца рашучая барацьба, ад каторай залежыць на доўгіе годы доля Польшчы,—ці ня час-бы цяпер падумаць аб тым, каб як найхутчэй утварыць умову польскага народу з беларускім народам? Ці ня час цяпер падняць справу адбудаваньня дзяржавы ў межах гістарычнай Літвы?

Беларускі друк у польскім асьвятленьні.

Перад намі дзьве апошніе кнігі журнала „Wschód Polski“. Вось што мы там чытаем аб беларускім друку ў аддзеле „Агляд друку“ ў № 423.

„У праціўнасьць да варожых адносін літоўскага друку, беларускі друк, навет незалежна-нацыянальны, з кожным разам набірае больш прыхільнасьці ў адносінах да Польшчы.

„*Беларусь*“, бязспорна найпаважнейшы беларускі орган, у № 15 (71) ад 24-1 друкуе артыкул пад загалоўкам „Гдзе паратунак? (Наша інтэлігэнцыя)“. У гэтым артыкуле аўтор даводзіць, што Беларусь грала выдатную ролю ў 1863 г. і кажа, што каб-б не паражэньне паўстаньня, то яно бясспорна высунуло б справу нацыянальнага будучыцтва Беларусі. Рэакцыя 1864 г. прынесла пачатак русыфікацыі Беларусі, перад усім пры пасрэдніцтве школьнай політыкі. З упадкам царызму раскідалася расійскае школьніцтво, а на пустым месьце стала пашырацца польская школа. І ня дзіво. Гэта ня віна палякоў, а недахват сьвядомай беларускай інтэлігэнцыі. У той-жа газэце ад 27-1 (№ 17) у рэдакцыйным артыкуле пад загалоўкам*) „Сьлёзы і надзеі“ аўтор сьцьвярджае, што палякі не датрымалі абятніц, што даваліся на пачатку ў справе раўнапраўнасьці мовы.

У артыкуле „Гдзе прычына?“ („Беларусь“ № 16 (72) ад 25-1) даводзіцца, што паражэньне расійскай контр-рэвалюцыі тлумачыцца мёртвасьцю ідэі „вялікай Расіі“. Тые самые бальшавікі церпяць паражэньне ад палякоў, авеяных ідэяй айчыны. Бо наступіў час адраджэньня народаў. Перамагчы бальшавікоў могуць толькі велікарускіе патрыёты, а не ўсерасійцы, гэтак сама як перамаглі іх палякі, латышы, эстонцы—патрыёты.

Ад 28-1 „Беларусь“ № 18 (74) ў артыкуле „Ці абудзецца гэта?“ ставіць пытаньне, ці дасьць Беларусі мір зрэалізаваньне лёзунгу, каторы выстаўляўся як дэвіз вайны: „вызваленьне малых народаў“. Пры мірaвых перагаворах Польшчы з Расіяй гэтае пытаньне асабліва востра стаіць для беларусаў; пры замірэньні справа вызваленьня Беларусі павінна быць галоўным варункам. Толькі адзіная, непадзельная і незалежная Беларусь можа ўстанавіць моцны і трывалы мір паміж Польшчай і Масквоўшчынай.

Назаўтра ў артыкуле „Трэба быць на варце“ рэдакцыя горача выступае проціў тэндэнцый разьдзелу Беларусі, пануючых у часьці польскага Сойму. Гэтакае „згвалтаваньне слабейшых народаў у цяперашні мамэнт няміпуча прывядзе сьвет да новай сусьветнай катастрофы“. Аўтор заклікае ўсе політычные, грамадзянскіе і культурные сілы Беларусі стаяць на варце, кажучы, што „айчына кліча нас на паратунак“.

Нарэшце 30—1 (№ 20—76) „Беларусь“ друкуе артыкул п. Г-ры пад загалоўкам „Да працы“. Аўтор заклікае да дружнай работы ў гэтым часе, калі паражэньне коаліцыі ў яе расійскай по-

*) Абмылка, трэба: „Словы і учынкі“.

літыцы прымушае яе да новых крокаў. Коаліцыя, касуючы блёка[illegible] капітулявала перад бальшавікамі. [illegible]аецца справа, ці будзе вялікая [illegible] Польшча. Аўтор верыць, ш[illegible] [illegible]шчы ёсьць элемэнты прыхіл[illegible] [illegible]ларусі, але баіцца вялікай [illegible]шчы. Найбольш палохаюць яго тыя, што марыць [а]б вялікай Польшчы і вялікай Расіі, [як]му ёсьць выгада разрэзаць жывое цела Беларусі на часткі.

У тым самым нумары п. Я. Кузневіч у артыкуле „Наш політычны кірунак" выказуецца за фэдэрацыю Польшчы, Украіны, Беларусі і іншых суседніх народаў.

У артыкуле „Яшчэ аб пераменах" (№ 4 ад 6—1) аўтор констатуе, што Беларусь ня можа і не павінна зьвязваць сваей лепшай будучыны з надзеяй на перамены таго або іншага політычнага укладу з небеларускай ульдай. Беларусь вельмі змучаная пераходнымі ваеннымі окупацыямі. „Зазначаем,"— піша рэдакцыя:—„што мы ня хочам больш ніякіх новых перамен і стаімо за цяперашні стан рэчы, жадаючы пасунуць яго на ўсю этнографічную Беларусь... Пастаянных перамен могуць жадаць толькі авантурнікі... Мы гэтак сама стаімо за перамены, але за такіе перамены, каторые адбудуцца пад уплывам *Беларускай* сілы і не пакінуць посьле сябе пустога месца, адчыніўшы вароты для ўсялякіх прахадзімцаў. Кожная окупацыя цяжкая, і не памогуць тут ніякіе надворные перамены... Лепшых варункаў для гадоўлі сваіх нацыянальных сіл мы прычакаць ня можам. Палёвазатыя спрад большасьці насяленьня бадай што немагчыма, расійшчына лажыць заграніцай; астаюцца адны вароты, праз каторые мы выйдзем да сваей ўласнай гасподы."

АПОШНІЕ НАВІНЫ.

Антанта і бальшавікі.

ЛЁНДАН, 18—VI. Рада Лігі Народаў, з прычын нязгоды савецкага ураду, пастанавіла адмовіцца ад свайго проэкту выслаць у савецкую Расію асобную камісію, пераклада[ю]чы ўсю адпавядальнасьць на савецкі урад.

Згода між Францыяй і Польшчай.

ПАРЫЖ, 18—VI. „Гавас" паведамляе, што польскі міністар Патэк выехаў з Парыжу посьле перагавораў з Мільеранам і Фошам. Результатам конфэрэнцыі Патэк зусім здаволен.

Пацьверджана поўная згода між Францыяй і Польшчай.

Врангель заняў Бердзянск.

АМСТЭРДАМ, 16—VI. „Le Times" паведамляе з Канстантынопалю, што гэн. Врангель заняў амаль без супраціўленьня Бердзянск. У сваіх праклямацыях ён дакляруе сялянам землю, але пры умовах, што яны будуць яму паслухмяны. У другім паведамленьні гаворыцца, што войскі гэн. Врангеля занялі Мелітопаль і ўзялі 5,000 палонных.

Агульная мобілізацыя ў Румыніі.

БУКАРЭШТ, 17—VI. Часьці чырвонага войска прымусілі румынскі урад слухацца іх загадаў дзеля забесьпячэньня граніц на выпадак эвэнтуальнага націску савецкай арміі.

Апрача гэтага каралеўскім дэкрэтам абвешчана ва ўсей Румыніі агульная мобілізацыя.

Міністэрскі крызыс у Польшчы.

Прапіўнікі утварэньня цэнтра левай большасьці прынялі ўсе меры к таму, каб не дазволіць утварэньня левага габінэту.

У кулуарах Сойму перадавалі чуткі аб тым, нібы францускі пасол заявіў аднаму з членаў ураду, што утварэньне цэнтра-левага габінэту, з дэпутатам Дашынскім на пасадзе міністра заграні́чных спраў будзе спаткаіо ў францускіх кругох няпрыхільна і можа разглядацца як разрыў француска-польскай дружбы.

Гэтые чуткі мелі ўплыў, відаць, на адносіны мяшчанскай фракцыі і конституцыйнай групы к цэнтра-леваму блёку; яны выказаліся проціў такой большасьці.

Соймавые фракцыі, каторые хацелі ўтварыць цэнтра-левы габінэт, маюць намер захаваць у сіле ўтвораную між сабою згоду.

Скульскі вёў перагаворы з прадстаўнікамі ўсіх соймавых фракцыяў аб утварэньні габінэту.

Асабліва прадаўжыцельные перагаворы вёў п. Скульскі з дэп. Вітасам. Апошні заявіў, што ён [illegible] ўчасьце соцыялістаў у урадзе [illegible]ым і што бяз іх будучы габінэт ня будзе мець даволі сілы.

Дэп. Вітас выказаў погляд, што самым лепшым выхадам з утворанага палажэньня было-б утварэньне цэнтра-левай большасьці. Поўны адказ аб адносінах сялянскага саюзу к утварэньню парлямэнцкі-здольнага габінэту дэп. Вітас дакляраваў даць сягоньня.

Фракцыя П. П. С. на ўчарашнім пасяджэньні прыняла пастанову, указваючую, што соцыялісты зусім ня будуць памагаць п. Скульскаму ў утварэньні габінэту.

Як відаць з выяўленых фракцыямі поглядаў, місія п. Скульскага мабыць ня будзе мець усьпеху.

З Варшавы тэлеграфуюць: Перагаворы паміж Скульскім і прадстаўнікамі розных фракцыяў не далі ніякіх вынікаў. Дзеля гэтага Скульскі лістом паведаміў Начальніка Дзяржавы, што ён ня можа ўзяць на сябе стварэньне габінэту.

Карэспандэнтам газэт Скульскі заявіў, што ён лічыць немагчымым у такі сур'ёзны момэнт стварэньне непарлямэнцкага, або чыноўнічага габінэту. Паводлуг яго слоў, становішчо вельмі скрутнае.

Перагаворы паміж асобнымі фракцыямі бадай спынены.

На фракцыйных пасяджэньнях прыняты рэзалюцыі, каторые паказваюць, што дабіцца згоды будзе вельмі трудна.

P. P. S. адмовіліся ад учасьця ў габінэце не цэнтра левага.

P. S. L.—левые так сама дамагаюцца стварэньня цэнтра-левага габінэту.

Фракцыя саюзу хрысьціянскіх рабочых прыняла рэзалюцыю аб тым, што яна дамагаецца як найхутчэйшага далучэньня да Польшчы „Ўсходніх Зямель" і стварэньня міністэрства спраў „Ўсходніх Зямель", а так сама поўнай рэквізыцыі харчовых прадуктаў.

Позна ў ночы 17 чэрвеня ў політычных кругох Варшавы пашлі чуткі, што стварэньне габінэту будзе даручано дэпутату Брэйскаму.

Конфэрэнцыя балтыцкіх дзяржаваў.

Першае пасяджэньне дэлегатаў балтыцкіх краёў адбылося 12-га чэрвеня ў Юр'еве.

Конфэрэнцыя пастанавіла стварыць 2 камісіі: 1) для разгляду эвономіцкіх спраў, 2) для разгляду тэрыторыяльных спраў.

Старшыня расійскай дэлегацыі запрапанаваў зараз жа спыніць барацьбу. Прапазыцыя гэта будзе абгаварывацца на чарговым пасяджэньні.

Політычныя весткі.

Конфэрэнцыя ў Спаа.

З Парыжу паведамляюць, што амбасадоры пастанавілі, што конфэрэнцыя ў Спаа адбудзецца 5-га ліпня.

Асобны мір Амэрыкі з Нямеччынай.

З Вашынгтону паведамляюць, што рэспубліканскі урад у Чікаго рэкламаваў у сваей праграме утварэньне асобнага міру з немцамі.

Пазычка для Нямеччыны.

З Гаагі паведамляюць, што міжнародовая камісія, каторая разглядала пытаньне ў справе пазычкі для Нямеччыны, закончыла сваю працу. Пастаноўлена прызнаць немцам 5 міл'ярдаў франкаў пазычкі ў золаце. Гэта сума можа быць павялічана да 15 міл'ярдаў. Пры гэтым пастанавілі выслаць у Нямеччыну сырой.

Маскоўскіе міл'ёны дзеля агітацыі ў тылох польскай арміі.

„N. Fr. Presse" паведамляе, што маскоўскі урад выдаў з агітацыйнай мэтай у тылох арміі Колчака ў золаце 80 міл'ёнаў рублёў, у тылох арміі Дэнікіна 70—міл'ёнаў рублёў. З гэтай мэтай высланы так сама аграмадные сумы ў Польшчу.

Ангельскі флёт зноў на Балтыку.

З Парыжу паведамляюць, што ангельскіе ўзброеные марскіе сілы прыбылі на Балтыку.

Мэта гэтай дэманстрацыі—абарона Фінляндыі на выпадак адбудаваньня савецкага флёту.

Узбраеньне Румыніі проці Вэнгрыі.

На дэмаркацыйнай лініі з Вэнгрыяй румыны чыняць вялікіе вайсковые падгатоўкі. Румынскі урад робіць гэта дзеля таго, што нібы ў Вэнгрыі паміж саюзам афіцэраў і вэнгэрскім урадам выйшло непаразуменьне, з прычыны непрызнаньня саюзам міравога трактату.

Хатняя вайна на Каўказе.

„Le Temps" паведамляе з Батуму: Грузінскі урад абвясьціў урадовае паведамленьне аб прызнаньні савецкай Расіяй незалежнасьці Грузіі. Пры гэтым урад паведамляе, што супакой і лад пануе толькі ў тэй часьці Грузіі, каторая знаходзіцца пад абаронай грузінскай арміі, а там, дзе знаходзіцца войско Антанты (округ Батуму) савецкая агітацыя дае сябе знаць. Пры гэтым грузінскі урад дамагаецца, каб яго войско пусьцілі ў Батум.

Дразды і Дзятлы.

(Адрывак з повесьці).

Я пачынаю свой сказ на лад бывальшчыны сівой:

Не за лясамі, не за гарамі, не за марамі, не за чужымі краямі, а на нашай зямельцы беларускай, на Сьлязанцы-рэчцы, прытоку Вільлі, жылі-былі Дразды і Дзятлы.

Гэта былі ня птушкі, а людзі пад прозьвішчамі: Дзятловічы і Драздовічы. Уся кроніка іх роду-племені, як кажуць людзі, была вось якая:

Калісьці жылі тут дзьве сям'і, адна пана Драздовіча, а другая пана Дзятловіча. Кажуць, што гэта былі багатые паны. Але дзеці іхніе ўжо парабіліся панкамі, бо, разьдзяліўшы паміж сабою зямлю, багацьце іх так сама разьдзялілося. Ад іх пайшла ўжо шляхта. Іхніе ўнукі ўжо парабіліся дробнай шляхтай. А далей ужо пайшло цэлае племя мужыкоў—у лапцёх, у сьвітках—словам, самі шэры, вясковы, Божы люд.

Узбудавалася цэлая вёска—палова Драздовічаў, а палова Дзятловічаў. А звалі і людзей і вёску проста „Драздзы і Дзятлы".

А калі вёску ў воласьці трэба было запісаць адным толькі словам (так заартачыўся пісар), дык выйшлі вялікіе сваркі.

— Няхай вёска завецца Драздоўшчына!—казалі Драздзы.

— Няхай вёска завецца Дзятлоўшчыны!—казалі Дзятлы.

Пісар на гэта ня даўся: Трэба, каб абодвы прозьвішчы былі склеены ў адно слова. Іначай пісар не хацеў. Гэта штука сур'ёзная і мудрая,—тлумачыў ён ім,—што напішаш пяром, ня вырубіш тапаром!

Думалі Драздзы і Дзятлы і задумаліся:

— Няхай вёска завецца Дрозда-Дзятлавай!—казалі Драздзы.

— Няхай вёска завецца Дзятла-Драздовай!—казалі Дзятлы.

Кожнаму з іх хацелася быць першым.

— Ды мы ж ганаровые, шляхэтные людзі, а яны проста дзятлы!—думалі Драздзы.

— Ды мы ж ганаровые, шляхэтные людзі, а яны проста драздзы!—думалі Дзятлы.

Як адны, так сама і другіе былі вельмі ўпартые і да ладу дайсьці не маглі ў гэтай справе. Адна палова вёскі надалей звалася „Дзятлова", а другая—„Драздова". І, быццым гусакі надутые, пазіралі яны адны на адных—Драздзы на Дзятлаў і Дзятлы на Драздоў.

Гэтакім чынам жылі яны сабе па асобку шмат гадоў. Паміж сабою яны ніколі ня раднілiся, вечарын разам ня ладзілі, а толькі служылі ва ўсей ваколіцы жывым календаром:

— Пятроўка, дзякаваць Богу!—гаварылі людзі—Драздзы з Дзятламі на кірмашы пабіліся.

— Пара жыто жаць!—гаварылі людзі,—Драздзы і Дзятлы сярпамі парэзаліся.

У воласьці на сходках яны так сама шыпелі адны на адных:

— Драздухі!—дразьніліся Дзятлы.

— Дзятлухі!—дразьніліся Драздзы.

З аднаго канца вёскі быў выган Драздоў, а з другога канца Дзятлаў. Скаціну сваю яны ня пасьцілі разам, а мелі двух пастухоў.

Асабістасьць іх родавых адзнакаў можна было прыкмячаць і на іх тварох і хвігурах. Дзятлы ў бальшасьці былі высокіе, ценькіе, цёмнавалосые і цёмнавокіе, а Драздзы былі нявысокіе, плячыстые, сьветлавалосые і сьветлавокіе. Але, побач з гэтымі асабістасьцямі, яны былі вельмі падобны адны да адных у складу жыцьця і ў пачуцьцях няпрыхільнасьці між сабою.

У кожнага з гэтых плямёў быў галоўны правадыр. Гэткіе правадыры навет судзьдзямі ў воласьці лічыліся.

— Нашы разумнікі!—гардзіліся Драздзы і Дзятлы гэтаю пакрасай сваіх родаў.

Драздзы мелі свайго Пранука. Клічка яго была „Галава", затое, што быў ён кароценькі, тоўсьценькі і насіў заўсёды і ўлетку і ўзімку, вялікую шапку, сыбірскую, з кудлатай авечкі. Ён быў агульным бацькам Драздова. Трэба было каму аб гаспадарцы параіцца—хадзілі да „Галавы". Трэба было купіць каня на кірмашы, карову, парсюка, дык не абыходзілося без „Галавы". А калі ён што колечы казаў, дык ужо было аман—ніхто супроціў яго не адважваўся і пікнуць. Меў ён ад сваіх Драздоў вялікую павагу і гэткую-ж выпіўку: То хрэсьбіны, то хаўтуры, тут ён кумам, там сватам, а ўсюды свой, ды яшчэ самы лепшы, самы паважны з сваіх.

— „Каму па каму, а мне два камы!"—гаварыў ён часта,—густа, седзячы на прызьбе суседа, плюючы ў бок (меў ён прывычку часта пляваць).

Дзятлы мелі свайго Сымона. Клічка яго была „Нага" за тое, што быў ён доўгі, як жэрдзь, і на адной назе. Другую нагу яму калісьці калода ў лесе адбіла. У сваіх Дзятлоў граў ён гэткую самую ролю, як „Галава" ў Драздоў. Меў і ён сваю пастаянную прыказку: „Альбо рыба, альбо піпка!"

„Нага" розьніўся ад „Галавы" тым, што гарэлкі ў губы ня браў, за што, не бяручы пад увагу і яго мудрасьць, Дзятлы лічылі яго яшчэ большым калекай, чымся за адбітую нагу...

Дзіўна было тое, што „Галава" з „Нагою", каторым трэба было быць найгоршымі ворагамі, былі, наадварот, найлепшымі прыяцелямі. Вясковые іх проста не маглі зразумець.

— Ды чорт злучыў нашага „Галаву" з гэтым Дзятлішчам!—бурчэлі Драздзы.

— Нехрысьць зжаніў нашага „Нагу" з тым Драздзюком!—скандзіліся Дзятлы.

Але ні першые і ні другіе не маглі іх разлучыць.

— Пішы „прапала"—казалі Драздзы.

„Вышай пупа не падскочыш!"—казалі Дзятлы і паставілі крыжык над гэтым нёзразумелым сяброўствам.

— Хіба сьмерць іх разлучыць—казалі і адны і другіе.

„Галава" з „Нагою" мелі шмат супольнага ў сваіх характарах. Абодва, нібы чорт крыжа, баяліся пісаных паперак і бліскучых гузікаў. Можа некаторым здаецца, што гэта самые простые рэчы, дык той памыляецца, бо пахнуць яны зусім ня проста. Чаго ў іх ня знойдзеш—падаткі, недаімкі, праўка дарог і мастоў, рэкрутчына, суды прыкрые, ды яшчэ гібель смачных рэчаў, што і на пальцах не пералічыш, калі навет лапці скінеш з ног.

Яшчэ супольнага мелі „Галава" з „Нагой", што сыпалі прыказкамі, нібы гарохам і вельмі любілі на начлегах байкі расказваць.

Начлегі заўсёды пачыналіся пасьля сенакосаў на балоце. У цёплую летнюю ноч звычайна бліскалі на лузе два вогнішчы. На адным беразе рэчкі начавалі Драздзы, на другім Дзятлы і сьпявалі гучные песьні, выкпіваючы ў ядраных словах адны адных. Але як толькі „Галава" і „Нага" пачыналі казкі сваю бяіць моладзі, рабілася ціха. Хрыплы гармонік „Тальлянка" („Італьянка") перарываў свае мізэрные тоны, спыняліся працяглые песьні дзяўчат... Усе слухалі разявіўшыся і вочы іх цямнелі. І чутно было пры астаноўках баячнікаў як прагавітые коні тупалі па мокрай лагчыне сваімі путанымі нагамі, як шчыпалі траву.

Часам ветрык дмухаў па вогнішчах, мігцелі га-

Кароль Альбэрт у ролі міравога пасрэдніка.

„Excelzior“ паведамляе, што бэльгійскі кароль меў доўгую гутарку з міністрам Гумансам. Нібы гаварылося там аб справе Цешынскай Сылезві. Нібы кароль Альбэрт чакае рашэньня Лігі Народаў у гэтай справе, каб адказаць на прынятую ім поопазыцыю быць ганаровым судзьдзёю.

Чытайце газэту „Беларусь“.

Француская вайсковая дапамога Польшчы.

Кракаускі „Іл. Кур. Цодз.“ паведамляе з Вены: Паводлуг вестак, адрыманых у Бэрліне, францускі урад пастанавіў зрабіць Польшчы значную вайсковую дапамогу для барацьбы з бальшавікамі—высылкаю колёніяльных войскаў. Перадаюць, што значные часткі чорных войскаў ужо гатовы к адпраўцы. У Бэрліне ўсё гэтае ставяць у сувязь з утварэньнем міжа Польшчай і Францыяй конвэнцыі аб узаемнай вайсковай дапамозе.

Непарадкі ў Італіі.

„Neue Freie Presse“ паведамляе, што 11 г. м. у Бары выбухнула агульная забастоўка і непарадкі. На вуліцах зроблены барыкады.

У баёх згінула 40 чалавек.

У Польшчы.

Новая газэта.

У Варшаве вышаў першы нумар газэты „Rzeczpospolita“—орган нар. дэмакраты.

У савецкай Расіі.

Аб расійскай контр-рэвалюцыі.

З Токіо паведамляюць, што весткі аб контр-рэвалюцыі ў Расіі не пацьверджаюцца. Такіе ж весткі адтрыманы з Рыма і Копэнгагэна.

Сон вясноуца.

Вы ня верыце сном і гатовы ўжо пасьмяяцца. — Пачакайце сьпяшацца. Ляпей паслухайце. Прышоў гэта я посьле цяжкае працы дамоў; павячэраў чым Бог паслаў ды лёг адпачыць. Сьцюдзёна! Нацягнуў я кажух аж на галаву—крыху пацяплела. Вось, думаю, каб скарэй тое цяпло—сеў бы ў сваім садочку пад бярозкай ды слухаў бы, як пяе салавейка. Тут мігнуўся воблік... Адчыніліся дзьверы ды ўвайшоў нейкі незнаемы сівы дзед. Галава яго трэслася, а ў вачох было гэтулькі нуды, болю, што я хацеў закрычаць ад страху, але ня змог. Ён падышоў да мяне ды кажа: „Ня пужайся, унучак, гэта я, твой прадзед.—сьвецка крыўды тваяго народу. Ужо доўгі час я хаджу па гэтым сьвеце, абглядаю людзкое сумленьне. Усё жыцьцё мае было горкае, як гэты асобы кіёк, на які я апіраюся. Мяне душылі непамернаю працаю, але я пух ад голаду. Разьдзіралі мае грудзі і па кавалках даставалі адтуль сэрцо. Я крычаў, енчыў, але літасьці ня мелі: людзі горш за зьвяроў. Ты добра гэта ведаеш ты сын гэтага пакрыўджанага народу...

Выцер дзед зрэбным рукавом сьлёзы і, шоргаючы па падлозе няслухмянымі нагамі, вышаў з хаты.

Алесь Старычанін.

Беларускае пытаньне на зьезде праваслаўнага духавенства.

Мы ўжо пісалі, што на зьезде праваслаўнага духавенства ў Менску між іншымі пытаньчямі, будзе разглядаецца пытаньне аб адносінах праваслаўнага духавенства да беларускага нацыянальнага руху. Пры вырашэньні гэтага пытаньня зьезд разьдзяліўся на два працiўных лягеры—сялянскіе сьвяшчэньнікі, як маючые больш беспасрэдных зносін з народнымі масамі і, такім чынам, разумеючые, як можна палепшыць долю нашага селяніна, сталі за тое, каб прыняць учасьце ў беларускім нацыянальным руху і пры сваей культурна-асьветнай працы карыстацца беларускаю моваю, а другі лягер, явна русыфікатарскі, стаяў проціў усяго гэтага. Актыўнымі антыбеларускімі опозыцыянерамі былі два члены зьезду—сьв. Ачапоўскі і Пакроўскі, каторым удалося ўзбударажыць проціў беларусаў некаторую часьць духавенства.

Дзякуючы іх стараньням і інтрыгам, спрэчкі пры вырашэньні беларускага пытаньня прынялі такі сумбурны характар, што прыняць аб ім пэўную рэзалюцыю зьезду было немагчыма.

Беларуская кроніка.

Дэлегацыя Беларускіх настаўнікаў у Начальніка Округу, 16-га чэрвеня. Начальнікам Менскага Округу п. Рачкевічам была прынята дэлегацыя ад Беларускага Настаўніцкага саюзу з прадстаўніком ад Школьнай Рады. Дэлегацыя абрысавала крытычнае матар'яльнае становішча настаўнікаў магістрацкіх школаў, з прычыны неакуратнай выплаты ім пэнсіі за мінулые месяцы. Асабліва пан Начальнік зьдзівіўся, калі даведаўся, што настаўнікам у лік пэнсіі за травень месяц магістрат выдае авансы па 100—200 марак у той час, як служачые іншых аддзелаў адтрымліваюць пэнсію ўжо за бягучы чэрвень месяц. Пан Начальнік распарадзіўся зараз жа зрабіць загад магістрату, каб пэнсія настаўнікам за мінуўшые месяцы безатклядна была выплачана і каб наперад служачым усіх аддзелаў магістрату пэнсія выплачвалася раўнамерна. У справе пайкоў для настаўнікаў п. Начальнік сказаў, што адпаведным установам і асобам ім зроблен загад, каб з служачых грамадзянскіх установаў настаўнікам выдаваліся пайкі ў першую чаргу.

Што да плебісцыту ў Магістрацкіх школах, які мецца зрабіць Шэф Сэкцыі Асьветы Магістрату, пан Рачкевіч сказаў, што ў Беларускіх школах ніякага плебісцыту ня можа быць.

Беларускае коопэратыўнае таварыства „Друк“, нядаўна заложанае, энэргічна разьвівае сваю чыннасьць.

У Вільні т-во ўжо мае сваю друкарню. Статут т-ва зацьверджаны на ўсю Беларусь.

У хуткім часе мае быць адчынены аддзел т-ва ў Менску, пры чым ёсьць проэкт арганізаваць тут друкарню і пераплётную майстэрню.

Прадстаўніком Менскага аддзелу т-ва выбралі п. Станкевіча.

Аб зьездзе культурна асьветных дзеячоў краю паднято пытаньне сярод беларускіх грамадзянскіх кругоў. Мэта зьезду—коардынiраваньне чыннасьці гэтых арганізацыяў на мясцох і інструктаваньне іх праз Беларускую Школьную Раду.

Канцэртнае турнэ Бел. хору ў провінцыі. Беларускі хор пад кіраўніцтвам п. Тэраўскага гэтымі днямі выязджае ў Слуцак. Хор мае аб'ехаць цэлы рад месц, як Раманово, Старыца і інш.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЬЦЕ.

Чарговае пасяджэньне думы, дзеля выбараў бурмістра і інш., мае адбыцца 22 чэрвеня.

Школьная справа. Каля 1-га ліпня мае адбыцца сход бацькоў вучняў усіх мястовых школ дзеля высьненьня нацыянальнасьцяў вучняў і мовы выкладаньня навук.

Большасьць школ мае перайсьці пад апеку нацыянальных школьных рад.

Пэнсія магістрацкім служачым за першую палову чэрвеня мае быць выплачана хутка, пры чым настаўнікам мястовых школ будуць плаціць у першую чаргу.

Выплата налогаў апошнімі днямі адбываецца ў магістраце вельмі добра. Бываюць дні, калі налогавых грошаў зьбіраецца болей 50 000 марак.

У мястовых дзіцячых прытулках пасьля бальшавікоў асталося каля 350 не мястовых дзяцей, аб якіх прыймаліся меры, каб як колечы разьмясьціць іх па тых паветах, дзе яны прыпісаны. І вось Ігуменскі павет першы запатрабаваў, каб яму выслалі пад яго апеку 20 дзяцей.

У саюзе злучаных коопэратываў ва ўсіх 13 крамах ад 16-га чэрвеня пачалася выпечка хлеба з чыстай жытняй мукі, бяз прымешкаў, у сваей уласнай пякарні.

Рэгістрацыя бедных людзей хрысьціянскага насяленьня м. Менску ідзець хутка. Зарэгістравана некалькі сот чалавек.

Сувязь Цэнтрабелсаюзу з саюзам віленскіх коопэратываў, дзеля чаго езьдзіў у Вільню п. Турчіновіч, мае хутка наладзіцца.

У коопэратыве „Украіна“ пайшчыкам прадаецца каўбаса па 40 мар. фунт.

На біржы ўчора давалі:

за	500 руб. цар.	—	1375	польск.	мар.
„	1000 руб. дум.	—	625	„	„
„	100 мар. ням.	—	425	„	„
„	1 франк	—	12½	„	„
„	1 фунт. ст.	—	700	„	„
„	1 доляр	—	162	„	„

лавешкі, палалі смалістые карчы, шыпелі, як жывые, і полымя расьціналося па баках чырвонымі абрусамі і асьвячала на момант даўгую паласу сумнага, скошанага лугу. Таемным зданьнём зьяньне агнёвае паказывало чорнае волава рэчкі, густые лазьнякі і калматые вольхі. Пры гэтым хвілёвым адсьвеце з густых хваль паўночных ценяў павылазілі на верх абветраные, высокіе стагі, нібы казачные зьвяругі...

Сьветлы пас даходзіў да самага лесу, дзе лясун пляце свае чары каля пнёў. Пры гэтым начлежнікі рабіліся ціхіе, як сама ноч. І доўга пасьля казак не маглі яны заснуць пад сваімі цёплымі кажухамі, пазіраючы на паўночнае сіто зорак у небе...

Паміж Драздоў і Дзятлаў яшчэ жыла пара асоб: Мэндаль Піскун і Чорны Яцкун.

Мэндаля звалі „Піскуном“ затое, што меў вельмі піскліві голас. Ён, здаецца, не гаварыў, а пяў, як птушка, цененькім, пяндзвым галасочкам.

Мэндаль Піскун жыў троху водаль ад Драздоў і Дзятлаў у панскім млыне і лічыўся так сама не абы якой шышкай паміж гаспадарамі.

Як ведама, млын, карчма і кузьня для сялян самае цікавае месцо. Там заўсёды поўнютка народу і розуму, і цікавых навін можна там набіраць поўнымі цэбрамі.

А калі ў Мэндаля Піскуна была і карчма, і млын, і кузьня разам, дык і дзіва няма, што гаспадары былі тамака болей чым дома.

Там і вечарынкі ладзілі, і вясельлі гулялі, і коней кавалі, і збожжо малолі, і гаспадарскіе справы абгаварывалі: там розные песьні сьпяваліся, дзіўные казкі расказваліся, там суседзі то цалаваліся-цмокаліся, то біліся-драліся з п'яных воч. Словам—жыцьцё там кіпело.

А Мэндаль заўсёды быў царом-уладарам, толькі пішчаў на ўсе лады, што яму „досіць адна цыбулька на дзень“.

— Мэндалька, казалі Дразды,—скажы па чыстай праўдзе, чаго варты гэтые дохлые Дзятлугі? шэльмяцы ды і толькі!

—Гі-гі-гі!—пішчэў Мэндаль па „чыстай праўдзе“—да каго вы сябе раўнуеце? Вы іх за падперэзіну падаткніцё.

Радаваліся Дразды—мазануў іх Мэндаль, нібы салам па валасох.

— Піскунок,—казалі Дзятлы, ты-ж не абы хто—гукні нам па шчыраму сумленьню, ці-ж не дарма жуюць толькі хлеб на зямлі гэтые паскуднікі Драздзюгі? Гадзюкі, яны, каб яны падавіліся!

— Гі-гі-гі!—пішчэў Мэндаль па „шчыраму сумленьню“—яны вам раўня, як сьвіньня да каня.

— Што праўда, то ня грэх, што торба, то ня мех!—радаваліся Дзятлы—ты, Мэндалька, чалавек з мазгамі.

Мэндаль меў здольнасьць уздавольваць усіх.

Чорны Яцкун жыў паміж Драздамі і Дзятламі, на самай граніцы, так што людзі і тут знайшлі прычапку, за што сварыцца: Дразды казалі, што ён да іх належыць, а Дзятлы ўпіраліся, што да іх.

Узіму хата Яцкуна была завалена вялікай гурбай сьнегу і яе бадай ня відаць было, апрача сівога дыму з чорнага коміну, а ўлетку яна была убраная ў зеляніво, як маладуха. Чаго-чаго толькі ня было ў яго на дзядзінцы: палын, мак, дзікая крапіва, мухаморы, маліньнік, сьвіные яблычкі, а на страсе, на пагніўшых мялінах нейкім дзівам буяў авёс.

Звaўся Яцкун „Чорным“ дзеля таго, што твар яго заўсягды быў закураны сажай. Відаць было, што ён ня мыўся з таго часу, калі бабка яго маленечкага ў начоўцы мыла. Яго праўдзівае прозьвішчо было Яцкевіч, але суседзі, дзеля большага форсу, называлі яго „Яцкуном“—чым болей ненатуральна, тым болей цікава, мабыць.

Быў ён высокі, ценкі, з кручкаватым, доўгім носам, з чорнымі, як вішні, вачыма, без барады і вусоў. Яму можна было даць і дваццаць і шэсьцьдзясят гадоў. Сваю абсмаленую бравярку ён ніколі не здымаў з плеч. На яго раменнай каліце заўсёды вісеў сцызорык. Быў Яцкун сталяром і бондарам і хадзіў так сама на паддзёншчыну.

Чалавек быў ён вельмі хмуры, пазіраў з-пад лобу, мала гутарыў, а калі часамі і гаварыў што колечы, дык толькі адны варожбы ды і то благіе, як напрыклад:

— „Курыца запяяла—нядобрае нешта будзе! Заяц дарогу перабег—няўдача! Віхар круціць—ліха нейкае ідзець.“

Любіў ён прарочыць гібель, няшчасьце і канец сьвету. Суседзі троху яго баяліся і былі рады, калі ён маўчаў. А ўсё ж такі лічылі яго сваім чалавекам і цягнулі яго кожны на свой бок. У яго ў хаце ніхто ніколі ня бываў ні з Драздоў ні з Дзятлоў. Усе гаварылі, што ён сьпіць у труне, каторую ён прыгатовіў сабе на сьмерць, што ў яго хаце ніводнага абраза няма; і тлумачылі нібы ён ведаецца з нячысьцікам.

Хатка і сенцы былі ў яго завалены розным запасам: мукой, хлебнымі сухарамі, сушанай бульбай, сушанымі яблыкамі, гарохам, грыбамі і інш. Усё гэта было запакована ў кублах, куфрах, скрынях, цабэрках начоўках, карытах, гаршкох, гладышох і іншых пасудзінах. Хата была так запакована,-што ён сабе і праходу ня меў у ёй. Толькі каля печы быў пусты кавалак зямлі.

Гэтые запасы, як Дразды і Дзятлы помняць, ён зьбірае дзясяткамі гадоў.

— Запас бяды ня чыне,—казалі адны.

— На чорны дзень,—казалі другіе. Калі ня лічыць сабакі і галагуцкага пеўня, дык у яго ніякай сям'і ня было.

Вось пры гэтакіх варунках, каля розных людзей, і багатых і бедных, жылі Дразды і Дзятлы. Як звычайна, яны часам забаўляліся, часам гаравалі, але жылі. Вызначаліся яны, паміж іншым, клічкамі, якіе давалі адны адным. Проста па імені рэдка хто каго называў. Імя замянялі розные клічкі: „Арцём Рабы“, „Міхась Куллаты“, „Марыля Крывая“, „Зьмітрок Лабаты“. Запас клічак можна было ў іх лічыць тысячамі.

Каля Сьлязанкі-рэчкі наогул гэта ўжываецца. Хрысьціянскае імя вісіць на калку, як лішняя хамуціна, а клічка дадзеная спрытным брахуном ужываецца да самай доўбні. Ды яшчэ часам як кемна і праўдзіва клічка вострага языка характарызуе чалавека, проста дзіву даешся! Дразды і Дзятлы так прывыклі да клічак, што лічылі за абразу, калі хто іх называў праўдзівымі імёнамі.

Сьмяртэльнымі ворагамі паміж сабою Дразды і Дзятлы ня былі. Напрыклад, няхай хто чужы закране на рынку Дзятла пры Драздох, ці наадварот, дык вочы выдзяруць у таго чалавека за суседа, бо „свой з сваім бейся, рубайся а чужы не мяшайся!“

Людзі—запрыяцелі злучаюцца разам або ў вялікай радасьці, або ў вялікім горы. Так было і тут. Але кровіка Драздоў і Дзятлоў яшчэ вельмі доўгая.

Вільня, 1914 года.

З. Бядуля.

Беларускі тэатр.

З незалежных ад Т-ва прычын сёньня спэктакль у „Беларускай Хатцы“ не адбудзецца.

СПОРТ.

Кожная культурна-прасьветная арганізацыя павінна мець спортыўны аддзел, бо без яго гэтакая арганізацыя ня можа лічыцца культурна-прасьветнай.

На чале гэтакага спортыўнага аддзелу павінны стаяць людзі, каторые шчыра любяць спорт (і спэцыялісты), а ня толькі дзеля матар'яльнай выгады.

Гэта павінны зразумець Нацыянальные Камітэты і зрабіць што небудзь у гэтым кірунку. Дзіўна, што дагэтуль у нас нічога ня было зроблена.

* * *

Як я даведаўся, у хуткім часе ў Менску гуртком спортсмэнаў будуць з'арганізованы „Спортыўна-гімнастычные курсы“ для падгатоўкі спортыўных інструктароў, у якіх у нас чуецца вялікая патрэба. На курсах будуць чытацца лекцыі аб фізычным разьвіцьці. Ужо запрошаны некаторые з лепшых Менскіх спортсмэнаў і лектароў.

У Варшаве гэтакіе курсы ўжо адчынены.

* * *

Надаўна уладай быў зачынен Менскі нац. жыдоўскі спортыўны гурток „Макаббі“, працаваўшы ў Менску з 1916 г. і меўшы пад сваім штандарам лепшых жыдоўскіх спортсмэнаў.

Як паведамляюць, гэты гурток у хуткім часе ізноў будзе адчынен.

* * *

У Менску цяпер толькі адзін польскі „Сокол“ шчыра працуе па карысьць спорту. „Сокол“ мае сваё памяшканьне па Магазыннай вул., дзе працуе шмат сяброў і ёсьць гімнастычные прыборы.

* * *

Ёсьць у Менску вайсковы спортыўны гурток, які досыць энэргічна працуе. Дзякуючы спорцмэнам гэтага гуртка, ў гарацкім садзе (б. Губэрнатарскім) зроблены пляц для ігры ў футбол і спортыўнай практыкі.

* * *

Як паведамляюць, у Менску пачнецца будоўля цырку, якога ня было з 1914 г., бо быў без патрэбы зьнесены. А цырк у Менску надта любяць.

* * *

У Гарацкім садзе часта бываюць футбольные мачты і трэніроўкі „Першай беларускай каманды“ і вайсковых каманд.

Футбольные мачты збіраюць шмат публікі, якая перш саўсім ня цікавілася. З іграчоў вызначаюцца вядомые шырокай публіцы: Е. Караваціі, Я. Слабуха, Карэлін, В. і М. Сьвечнікавы, Выгоцкі, Лапідус і інш.

* * *

Надаўна адбыўся футбольны мачт мясцовай каманды і вайсковай каманды 4 арміі. Мачт кончыўся на карысьць вайсковых 4:1.

У мясцовай камандзе добра ігралі Каравацкі, Слабуха, Вольфоўскі і Выгоцкі.

Ул. Я—віч.

Рэдактар—Я. ЛЁСІК.
Выдавец—К. ТАРЭШЧАНКА.

Паровая мельница

Бр. Раковщик Нижне-Ляховск. 16.
помол всякого рода зерна.
237.

КИНЕМАТОГРАФ
„МОДЕРН“
Францишканская ул.

КИНЕМАТОГРАФ
„ИЛЛЮЗИОН“
Мицкевича ул.

Язэп Зальцман
Зборавая (Праабраж.) № 15.

КАНТОРА АБМЕНУ ВАЛЮТ

купля і прадажа працэнтных папераў.
413

Всем и повсюду известная
ХИРОМАНТКА
мисс Борщова,

которая предсказывает с линии рук, зеркала, наружности человека, характер, болезни, кражи, любовь и путешествие, об'ясняет сны и предсказывает НАСТОЯЩЕЕ, ПРОШЛОЕ и БУДУЩЕЕ.

Пусть всякий поспешит по адресу.
Минск, уг. Крещенской и Полицейской, д. Іоселевича, рядом с баней Плавского № 21—24. кв. № 2. 283

KRYNICA ХРЫСЬЦІЯНСКАЯ ТЫДНЕВАЯ ГАЗЭТА

„Krynica“ каштуе: на год . . . 40 мар.; на 3 месяцы 10 „; асобны нумар 1 „

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Сьв.-Янская вул., дом пры Касьцеле сьв. Яна 2. 411

Хто мае

вальцы да вырабу штучнай вашчыны, альбо вашчыну, прашу тэрмінова даць вестку аб гэтым у рэдакцыю „Беларусь“.

Шарамэт. 426

Прадаецца фальварак

80 дзесяцін, 40 вёрст ад Менску. Спыт. Валоская (Крашчанская) 11, к. 4, ад 5—7 гадз. 424

—)Выдавецкі аддзел(—
БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЬНАЙ РАДЫ
знаходзіцца па Койданаўскай вул. № 21, кв. 4.
Чыннасьць ад 9—3 гадз. 423

Покупаю по высокой цене
старинные вещи

картины, гравюры, миниатюры, гобелены, ковры, фарфор, платиновые монеты, стекло, бронзу, меха, мебель и др.

Ш. М. Рапопорт,

Ул. Мицкевича (Захарьевская) № 45.
409.

Мяняльная кантора
Н. Гальперына, Н. Ідзэльчыка і Ко
Койданаўская 22.
Купля і прадажа розных валют.
№ [illegible]

СЕГАДНЯ ПЕРВАЯ СЕРИЯ.
„Клуб Желтаго Треугольника.“
Грандиознейшая драма в 4-х сериях 24-х частях 8000 метров.

Борьба женщин
или Триумф Счастья — драма в 5 частях.
Сверх программы АВТОМОБИЛЬНЫЕ ГОНКИ В ПАРЫЖЕ.

Беларуская Школьная Рада

запрашае скончыўшых 1, 6 і 7 Беларускіе Вышэйшые Пачатковые школы м. Менска на урачысты выпускны акт, які мае адбыцца ў пятніцу, 18 чэрвеня ў 12 гадзін дня ў залі Школьнай Рады. 421

Беларускіе курсы для рабочых

Беларуская Школьная Рада мае адкрыць у найхутчэйшым часе беларускіе агульна-асьветные курсы для рабочых, а так сама вячэрнюю школу для неграматных рабочых. 419

Абвестка № 17.

Згодна з пастановай Гэнэральнага Камісара Усходніх Зямель № 069 („Урадовы Двен.“ № 29/73) пастанаўлию:

1) Забараняецца адчыненьне новых, а ад 25 чэрвеня г. г. і далейшую работу іствуючых: а) друкарань, літаграфіяў, ці іншых майстэрняў, дзе выраблюцца літары, ноты, малюнкі без дазволу Начальніка Округа, б) Складаў шрыфту, каторы назначаны для прадажы, пазычкі, раздачы - без майго дазволу.

2) Заявы аб дазволе адчыніць друкарню трэба падаваць Начальніку Округа за маім пасрэдніцтвам. У заявах трэба напісаць імя прозьвішчо і адрэс уласьніка і кіраўніка, калі кіраўнік ня ёсьць уласьнікам, пасьля мейсцо, дзе будзе заложана друкарня. Да заявы трэба далучыць пісьменную згоду кіраўніка аб тым, што ён прыймае ўсе гэтые абявякі.

3) Пастанова гэта ня тычыцца да друкарань ураду войска польскага.

4) Той, хто нарушыць вышэйсказанае, падлягае вось такім адміністрацыйным карам, назначаным Начальнікам Округа:
а) штрафу да 30000 м. з заменай на арэшт, калі маемасьць не пакрые штрафу.
б) Закрыцьце друкарні, ці складу.
в) Конфіскацыя шрыфту і друкарскіх прылад.

Гэтые кары могуць быць споўнены адначасна ўсе, альбо па асобку.

Вісьнеўскі, в. аб. Камісара м. Менску.
Я. Дубічынскі, рэфэрэнт адміністрацыйна—паліцэйскі.

Менск, 9 чэрвеня 1920 г.

У коопэратыве „ЗЛУЧНАСЬЦЬ“

ПРАДАЮЦЦА ВОСЬ ЯКІЕ КНІГІ:

1. Беларускі слоўнік—*Насовіча.*
2. Этнаграфічные зборнікі—*Шэйна.*
3. Беларусы-Сакуны—*Сербава,*

Выдавецтва Беларускай Школьнай Рады

запрашае ўсіх асоб, якіе працуюць па састаўленьню і перакладу падручнікаў, а так сама маюць свае уласные літэратурные і навуковые творы, прысылаць рукапісы для друку за адпаведны аўторскі гонарар па адрэсу выдавецтва: *Менск, вул. Рэйтана (б. Юр'еўская) д. № 12.*

Чыннасьць ад 9 да 3 гадз. папоўд. 297

РУНЬ

Ад 1 мая г. г. у Менску выходзіць новая часопісь.

Рунь *беларускае літэратуры і мастацтва.*
Рунь у ліку сваіх супрацоўнікаў мае самые найпаважнейшые літэратурные і мастацкіе сілы.
Рунь захоплівае сваім зьместам беларускае пісьменство, поэзію, гісторыю, памяткі мінуўшчыны, крытыку і г. д.
Рунь служыць вялікім ідэалам красы і свабоды.
Рунь выходзіць ня меней 4 х разоў у месяць.
Рунь каштуе з перасылкай толькі 5 марак за адзін нумар, (двайны нумар 10 м.), на 1 м-ц. — 20 мар., на 3 мес. — 60 мар.
Рунь выходзіць пад рэдакцыяй Янкі Луцэвіча, выдавец проф. Ваплаў Івапоўскі.

Адрэс: Рэдакцыя—Менск, Кашарская 10, кв. 5, (адчын. ад 10 да 11 г. зр.).
Адміністрацыя: вул. Міцкевіча, Беларускі Дом (адчын. ад 9 да 3 г. дня). 293

Вышла з друку першая кніжка беларускага зборніка

НАША НІВА

ЗЬМЕСТ: Да чытачоў. Ант. Навіна: Палітычные лёзунгі беларускага руху. Інж. А. Галавінскі: Увагі аб эканамічна-фінансавай адбудове Беларусі. А. Уласаў: Хатніе промыслы ў Беларусі. І. Луцкевіч: „Ай Кітаб“. Янка Купала: Хаўтурны марш (пераклад з К. Уейскага). — Максім Гарэцкі: Патаёмнае, з індускае поэзіі (пераклад). Бібліографія. Беларускіе нацыянальные установы.

Цана 10 марак.

З дазв. вайсков. цэнзуры № 506. 18 VI
Менск. Друкарня Інвалідаў.